Источник: "Краязнаўчая газета" -2013-06-20

# На тым тыдні...

✓**З 7 па 9 чэрвеня** ў Паставах прайшоў традыцыйны **фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік»**. Сёлетні – ужо дваццаты, шаснаццаты раз ён мае статус міжнароднага. У праграме былі разнастайныя музычныя, літаратурныя і тэатральныя імпрэзы, выстаўляліся вырабы народных майстроў. У касцёле адбыўся канцэрт арганнай музыкі, у Доме рамёстваў адкрылася мастацкая выстаўка, а на прыступках Палаца Тызенгаўзаў прайшоў канцэрт «Музыка беларускіх палацаў і сядзібаў». У гарадскім парку адкрылі памятны знак у гонар фестывалю.

✓ **14 чэрвеня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшло **адкрыццё выстаўкі «Мітрафан Доўнар-Запольскі – даследчык гісторыі трох народаў»**.

У экспазіцыі прадстаўленыя кнігі з асабістага збору навукоўца, прыжыццёвыя выданні, новыя перавыданні яго фундаментальных працаў і інш. Выстаўка падрыхтавана сумесна з Музеем гісторыі НАН Беларусі, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Францыска Скарыны і Санкт-Пецярбургскім філіялам Архіва Расійскай акадэміі навук. *Падрабязней чытайце ў наступным нумары.*

✓**15 чэрвеня** ў канцэртнай зале «Мінск» у межах праекта «У абарону жыцця» адбыўся **спектакль «Маё сэрца б'ецца»**. Мэта праекта – прыцягнуць увагу да праблемы абортаў, якіх штодня робіцца вялікая колькасць.

Прэм'ера спектакля «Маё сэрца б'ецца», пастаўленага рэжысёрам і акцёрам Паўлам Харланчуком, адбылася ў 2009 годзе і мела вялікі поспех. Пасля шэрагу аншлагаў у Маладзёжным тэатры эстрады спектакль выйшаў на вялікую сцэну канцэртнай залы «Мінск». У пастаноўцы прагучала цудоўная музыка аўтара і кампазітара Алёны Сітнік.

✓**15 чэрвеня** ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту адбыўся **першы «Сырны фестываль»**. Пад час мерапрыемства наведнікі маглі пазнаёміцца з вялікай колькасцю відаў сыроў і нават пакаштаваць іх, а таксама пазмагацца за Сырны Алімпійскі медаль, узяць удзел у іншых мерапрыемствах. Старажытным і класічным танцам гасцей свята навучалі калектывы «Вярсаль» і «Гістрыён». У музычная частцы струнным квартэтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі былі выкананыя паланез «Развітанне з Радзімай» Агінскага і «Вальс» Штрауса, прайшоў музычны батл паміж дуэтамі віртуозаў-акардыяністаў і баяністаў, канцэрт квартэта саксафаністаў ВІА «Ё-гурт».